# ЗРОБЛЕНАЕ ЗАСТАЕЦЦА

2014-ы ўжо ў гісторыі, і мы папрасілі вядомых людзей узгадаць самыя яркія яго культурныя падзеі.



**Ганна ЗАПАРТЫКА, дырэктар Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва:**

— Чамусьці адразу ўзгадваюцца спартыўныя — у гэтай сферы год быў сапраўды яркім. Культура таксама не адпачывала. Як гісторык, адзначу свята беларускага пісьменства ў Заслаўі. Часта бываю на падобных мерапрыемствах і заўважыла, што ў гэты раз яно было асабліва масавым, жывым. Адчуваўся агульны творчы ўздым, люблю гэта свята за тое, што там заўсёды шмат цікавых людзей, незабыўных сустрэч.



**Ірына ДАРАФЕЕВА, заслужаная артыстка Беларусі:**

— Лічу, што адной са значных культурных падзей быў мюзікл «Дуброўскі», зроблены сіламі студэнтаў універсітэта культуры, і ў прыватнасці кафедры эстрады, якую я ўзначальваю. Прыемна, што мы выйшлі за межы адной пляцоўкі, ужо далі больш як пятнаццаць спектакляў, у тым ліку і на «Славянскім базары ў Віцебску». Наперадзе — Год моладзі, і «Дуброўскі» стаў выдатным прыкладам, як маладыя людзі могуць тварыць, заяўляць пра сябе. Думаю, мюзікл працягне сваё жыццё, у нашых планах — пакарыць усе вялікія пляцоўкі краіны.



**Уладзімір КАРАЧЭЎСКІ, дырэктар Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі:**

— Адкрыццё новага музея Вялікай Айчыннай вайны — гэта знакавая падзея ў гісторыі краіны. Гэта помнік на стагоддзі, лічу, што адна з яго асноўных функцый — выхаваўчая, ён заўсёды будзе нагадваць нам пра мінулае, а таксама прымушаць задумвацца пра дзень сённяшні, светлы і шчаслівы, і пра будучыню, без вайны і страт. Асабліва прыемна, што музей адразу стаў запатрабаваным, там заўсёды шмат людзей, гэта гаворыць аб тым, што мы памятаем подзвіг нашых дзядоў і ўдзячныя ім за наша жыццё.



**Ганна ХІТРЫК, актрыса:**

— Для тэатральнай супольнасці, вядома ж, яркай падзеяй была Нацыянальная тэатральная прэмія. Яе чакалі два гады, абмяркоўвалі. Былі розныя меркаванні, але ў такой справе не бывае агульнай думкі ва ўсіх. Творчасць — гэта заўсёды суб'ектыўна. Я, напрыклад, лічу, што «Пан Тадэвуш» — гэта выдатны спектакль Купалаўскага тэатра, падняць такую літаратурную глыбу здольны не кожны рэжысёр. Але чула і іншыя водгукі: маўляў, шмат незразумелага ў пастаноўцы. Твор сапраўды складаны, і глядач павінен быць падрыхтаваным, гэта вам не коміксы для дзяцей.



**Алена ТУРАВА, кінарэжысёр, пісьменніца:**

— Без варыянтаў, галоўная падзея года — чэмпіянат свету па хакеі. У Беларусі ён стаў не толькі спартыўным мерапрыемствам, але і культурным: задзейнічаны былі амаль усе творчыя калектывы краіны. І хоць я не з'яўляюся хакейнай фанаткай, таксама была захоплена ў палон гэтых падзей. Што ж датычыць непасрэдна маіх прафесійных інтарэсаў, то не заўважыла ніякіх знакавых пастановак. Хаця асабістыя дасягненні ў мяне былі: «Соф'я Гальшанская», аўтарам лібрэта якой я з'яўляюся, атрымала Нацыянальную тэатральную прэмію, фільм «Кіндэрвілейскі прывід» працягнуў збіраць узнагароды і ў мінулым годзе, а кніга, напісаная па ім, цяпер мае другую прэмію конкурсу «Залаты купідон».

**Наталля СЦЯПУРА**
stepuro@rambler.ru

РЕПОЗИТОРИЙ